УДК 379.82

# ЦЭНТР СЯМЕЙНА-БЫТАВОЙ КУЛЬТУРЫ: ДАРОЖНАЯ КАРТА

***Казлоўская Людміла Іванаўна,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў,*
***Садоўская Валянціна Сцяпанаўна,***
*доктар педагагічных навук, прафесар,*
*Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры*

# FAMILY AND HOUSEHOLD CULTURE CENTER: ROAD MAP

***Kozlovskaya Lyudmila Ivanovna,***
*Ph.D. (Pedagogical Sciences), Associate Professor,*
*Belarusian State University of Culture and Arts*
***Sadovskaya Valentina Stepanovna,***
*Full Doctor of Pedagogical Sciences, Professor,*
*Moscow State Institute of Culture*

**Анатацыя**. У артыкуле прадстаўлена лагічная пабудова цэнтра сямейна-бытавой культуры асобы, накіраванага на фарміраванне маральна-эстэтычных каштоўнасцей асобы праз удасканаленне і пераўтварэнне культурна-бытавога асяроддзя. Для вырашэння гэтай праблемы прапануюцца сродкі, формы і метады сацыяльна-культурнай дзейнасці. Аўтары адзначаюць, што важнай умовай арганізацыі педагагічнага працэсу цэнтра з'яўляецца сістэмнасць, паслядоўнасць і дзейнасны падыход у яго рабоце.

**Abstract.** The article gives the logical construction of the family and household culture center, which aims at the formation of moral and aesthetic values of the individual by means of the improvement and transformation of the cultural and household environment. To solve this problem, the paper proposes to use the means, forms and methods of social and cultural activity. The authors note that the pedagogical process of the center requires consistency and activity approach for its work.

**Ключавыя словы:** сям'я, традыцыі, сацыяльна-культурная дзейнасць, цэнтр сямейна-бытавой культуры, гульня, арт-тэрапія, аматарскія аб'яднанні, культура побыту, вольны час, дзейнасны падыход.

**Keywords**: family, traditions, social and cultural activities, family and household culture center, game, art therapy, amateur associations, culture of everyday life, free time, activity theory.

Сям'я была і застаецца традыцыйна вядучым сацыяльна-культурным інстытутам. Сям'я як базавая каштоўнасць у наш час вытрымлівае ўздзеянне глабальнага працэсу дэфармацыі, які выяўляецца ў празмернай варыяцыі жыццёвых стыляў. Сёння сям'я, нажаль, не валодае надзейнай устойлівасцю.

У наш час адметнымі прыкметамі дэфармацыі сям'і з'яўляюцца: колькасць разводаў, колькасць няпоўных сем'яў і маці адзіночак, нарастанне

сацыяльнага сіроцтва, наркаманія і алкагалізм сярод падлеткаў, канфліктнасць у сямейных зносінах, няўменне ці нежаданне мужа ці жонкі паляпшаць маральна-псіхалагічны клімат сям'і, вырашаць ўзнікаючыя канфлікты ўзаемнымі саступкамі.

Арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці з сям'ёй з'яўляецца актуальным напрамкам у педагагічнай навуцы. У наш час нельга не ўлічваць разнастайнасць тыпаў сучаснай сям'і: поўныя ці няпоўныя, шматдзетныя, адна-двухдзетныя, бяздзетныя, маладыя і "патрыярхальныя", няшчасныя, маргінальныя, асацыяльныя сем'і і інш.

Сям'я вызначаецца не толькі колькасцю яе чальцоў, але і сямейнымі адносінамі, прынятымі ў ёй. Яна характарызуецца ўзроўнем выхаванасці і духоўнага развіцця чальцоў сям'і, культурай іх зносін, укладам жыцця, традыцыямі і абрадамі.

Варта заўважыць, што сёння ў практыцы сацыякультурнай дзейнасці распрацаваны і актыўна ўкараняюцца разнастайныя формы арганізацыі вольнага часу сем'яў: сямейныя святы, сямейныя дні адпачынку, клубы па інтарэсах, конкурсныя праграмы: «Тата, маці, я – спартыўная сям'я», «Тата, маці, я – дружная сям'я", "Сямейныя гасцёўні", "Вечары на канапе", святкаванне "залатога" і "сярэбранага" вяселляў, сустрэчы за кубачкам гарбаты і г.д. Яны дазваляюць стварыць атмасферу пазітыўных зносін, задавальнення і развіцця агульных інтарэсаў, садзейнічаюць выпрацоўцы ўстойлівых маральна-эстэтычных ідэалаў. У змесце такіх праграм сустрэчы і гутаркі з цікавымі людзьмі, знаёмства з рознымі бакамі жыцця сям'і, аповяды аб свеце захаплення ў сем'ях, выставы, агляды літаратуры і г.д.

Для гарманізацыі сямейна-бытавых зносін прапануецца мадэль цэнтра сямейна-бытавой культуры [1 с. 221-225]. Мэта такога цэнтра – садзейнічаць фарміраванню маральна-эстэтычных каштоўнасцей асобы праз удасканаленне або пераўтварэнне асабістага культурна-бытавога асяроддзя.

Культурна-бытавое асяроддзе – гэта сфера, у якой рэалізуецца сутнасная прырода чалавека, накіраваная на задавальненне яго жыццёвых запатрабаванняў у жыллі, харчаванні, адзенні, працягу роду, выхаванні дзяцей, культурным правядзенні вольнага часу і г.д. [1 с. 218].

Асаблівасцю цэнтра з'яўляецца яго адкрытасць і даступнасць, яго паслугамі павінны мець магчымасць карыстацца ўсе заахвочаныя. Гэта не азначае, што ўсе паслугі будуць аказвацца бясплатна. Але ж кожны чалавек будзе мець магчымасць выбару. Напрыклад, нараўне з платнымі кансультацыямі спецыялістаў працуе бясплатны інфармацыйна-кансультацыйны пункт; разам з платнымі гульнявымі аўтаматамі арганізавана бясплатнае карыстанне гульнявым і спартовым інвентаром і г.д.

Важнай умовай вырашэння педагагічных задач цэнтра з'яўляецца дзейнасны падыход у арганізацыі яго работы. Прадугледжваецца актыўнае ўключэнне асобы ў педагагічны працэс, калі яна з аб'екта выхавання становіцца яе актыўным суб'ектам. Ажыццяўляецца працэс самавыхавання асобы і сям'і ў цэлым.

Таксама важнай умовай арганізацыі педагагічнага працэсу з'яўляецца сістэматычнасць і бесперапыннасць педагагічнага ўплыву на асобу. Сутнасць гэтай умовы – у фарміраванні станоўчых стэрэатыпаў паводзін, якія садзейнічаюць развіццю патрэбнасці ў духоўным і фізічным самаўдасканаленні.

Арганізацыйна-метадычная задача цэнтра заключаецца ў мадэляванні спосабаў рэалізацыі пералічаных умоў працы і сямейна-бытавой культуры. Гульня ў гэтай мадэлі выступае найважнейшым сродкам уключэння людзей у зносіны. Яна адпавядае прыродзе чалавека, садзейнічае ўзбагачэнню яго эмацыйнай сферы, набыццю станоўчых матываў паводзін, стварэнню аптымістычнага настрою, рэкрэацыі. У выніку гульнявых зносін устанаўліваюцца нефармальныя добразычлівыя адносіны паміж людзьмі, здымаюцца псіхалагічныя бар'еры паміж раней незнаёмымі людзьмі. Разам з тым гульня дазваляе выявіць індывідуальныя здольнасці і схільнасці чалавека, дапамагае ў выбары заняткаў. Даступнасць і адкрытасць гульні, магчымасць вольнага ўваходу і выхаду з яе спрыяюць уключэнню чалавека ў розныя віды дзейнасці, пры гэтым кожны адчувае сябе нязмушана і вольна. Добраахвотны, вольны характар гульнявой дзейнасці забяспечваецца бесперапынным, нерэгламентаваным функцыянаваннем цэнтра.

Асноўныя напрамкі дзейнасці цэнтра забяспечваюцца комплекснымі формамі працы. Выбар формаў вызначаецца інтарэсамі і патрэбамі патэнцыйных наведвальнікаў цэнтра, матэрыяльна-фінансавымі магчымасцямі клубнай установы, наяўнасцю кваліфікаваных спецыялістаў і педагагічных кадраў. Таму прапанаваны пералік напрамкаў работы цэнтра можна лічыць толькі прыкладным.

Пакой псіхалагічнай рэабілітацыі. Адмысловае значэнне для захавання здароўя чалавека мае псіхаэмацыйная раўнавага, пазбаўленне асобы ад празмерных адмоўных эмоцый, стрэсаў. Таму мэтазгодна праводзіць актывізацыю псіхаэмацыйнай сферы чалавека метадамі рацыянальнай псіхатэрапіі, асноўнае прызначэнне якой – у фарміраванні разумных аптымістычных адносін да жыцця. Магутным рэгулятарам эмоцый з'яўляюцца зносіны з сябрамі, прыродай, мастацтвам; уключэнне асобы ў інтэлектуальную, рухальна-аздараўленчую дзейнасць; заняткі мастацкай і тэхнічнай творчасцю; відовішчна-гульнявая дзейнасць.

Састаўной часткай разгляданага напрамку з'яўляецца арт-тэрапія, якая ўяўляе сабой прафілактыку стрэсу пры дапамозе мастацкай творчасці.

Да арт-тэрапіі адносяць:

- драматызацыю і гульнятэрапію;
- музыкатэрапію;
- харэатэрапію;
- казкатэрапію;
- бібліятэрапію;
- пясочную тэрапію;
- фітатэрапію;

– водаратэрапію;
– арыгамі і г.д.

У кожнага віду арт-тэрапіі ёсць свая спецыфіка. Музыкатэрапія можа прымяняцца сумесна з гульнятэрапіяй, казкатэрапіяй, фітатэрапіяй.

Музыкатэрапія – гэта лячэнне гукамі. Музыкатэрапія, напрыклад, дапамагае змагацца з цяжкімі хваробамі, умацоўвае дух і ўдасканальвае розум. Араматэрапія пад музыку спрыяе зняццю нервовай напругі і стомленасці. Сумяшчэнне відаў арт-тэрапіі дапамагае развіваць у чалавеку крэатыўнасць і цэласнасць асобы, садзейнічае павышэнню самаацэнкі, вучыць расслабляцца і пазбаўляцца ад негатыўных эмоцый і думак, уздзейнічае на агульны стан чалавека.

Экспрэс-школа культура побыту. Мэта школы – у мінімальна сціснутыя тэрміны даць максімум карысных ведаў па арганізацыі свайго побыту. Ажыццяўляецца гэтая мэта з дапамогай саміх слухачоў, якія па чарзе выступаюць у ролі асоб, якія перадаюць неабходную інфармацыю іншым людзям. Роля педагога ў тым, што ён стварае ўмовы, пры якіх адбываецца максімальнае ўключэнне слухачоў у працэс навучання.

Змест дзейнасці чалавека ў побыце дазваляе вызначыць прыкладную сістэму заняткаў, лекцый, гутарак, майстар-класаў па наступных кірунках:

– стварэнне і падтрыманне сямейных традыцый; правядзенне сямейных урачыстасцей;
– стварэнне сямейнага іміджу;
– арганізацыя сістэмы сямейнага аздараўлення;
– выкананне эскізаў інтэр'ераў, мэбляванне пакояў;
– стварэнне сістэмы здаровага харчавання;
– нарыхтоўка прадуктаў, іх апрацоўка і прыгатаванне здаровай ежы;
– набыццё і выраб прадметаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці;
– рамонт і ўборка кватэры, прысядзібнага ўчастка;
– развядзенне саду і агароду, пакаёвых раслін;
– планаванне адпачынку сям'і;
– заняткі фізкультурай і спортам, рыбалкай і паляваннем;
– калекцыянаванне, хобі, турыстычныя паходы і г.д.

Аддзел творчай самарэалізацыі асобы. Зместам дзейнасці аддзела з'яўляецца работа творчых майстэрняў па розных відах народных промыслаў і рамёстваў: пляценне з саломкі, макрамэ, вышыванне, ткацтва і інш. Яго дзейнасць аб'ядноўваюць такія праграмы, як “Прэзентацыя”.

Асацыяцыя аматарскіх аб'яднанняў з'яўляецца формай аб'яднання людзей, неабыякавых да творчасці, якія імкнуцца да рэалізацыі сваіх ідэй. У асацыяцыю могуць уваходзіць самыя разнастайныя аб'яднанні і клубы: таварыства барацьбы з брыдкаслоўем, клуб аматараў і знаўцаў народных рамёстваў, клуб аўтагеннай трэніроўкі, клуб вегетарыянцаў, аматары хатніх майстэрняў і інш. Максімальнае прыцягненне да аматарскіх аб'яднанняў насельніцтва – адна з задач асацыяцыі. На чале аб'яднанняў становяцца не

спецыялісты-прафесіяналы, а аматары, людзі, для якіх хатняя праца – другое хобі.

Атэлье па арганізацыі вольнага часу. Прызначэнне "атэлье" – аказанне насельніцтву дапамогі і паслуг, звязаных з больш рацыянальным выкарыстаннем вольнага часу. Дыяпазон такой дапамогі можа быць бясконцым: распрацоўка сцэнарыяў сямейных урачыстасцей, выраб да іх рэквізіту і афармлення, падрыхтоўка вядучых для такіх урачыстасцей, і афармлення пляцоўкі, падрыхтоўка сюжэтна-дыдактычных гульняў для дзяцей рознага ўзросту, падрыхтоўка хатніх спектакляў, канцэртаў, падбор для іх рэпертуару, распрацоўка праграм прыёму гасцей, турыстычных паходаў, кансультацыі спецыялістаў для асоб, якія выбралі індывідуальныя формы адпачынку і г.д.

Пры "атэлье" можа працаваць "банк сацыяльна-культурных ідэй", у якім фарміруюцца найбольш цікавыя праекты арганізацыі культурна-творчай дзейнасці. Мэта такога банка – атрымаць ад насельніцтва, моладзі як мага больш традыцыйных і нетрадыцыйных падыходаў да арганізацыі побыту і рацыянальнага выкарыстання вольнага часу.

Пакой гульні і цацкі. Для яго функцыянавання павінна быць выдзелена спецыяльна абсталяванае памяшканне, якое можа быць падзелена на некалькі пляцовак: пляцоўка для настольных гульняў, для рухомых гульняў, для гульняў-атракцыёнаў, для камп'ютарных гульняў і г.д. У гульнявым пакоі ствараюцца такія ўмовы, калі нават выпадковы чалавек, які патрапіў сюды, адчуе сябе нязмушаным і вольным. Важнай асаблівасцю працы пакоя гульні з'яўляецца ажыццяўленне дзейнаснага падыходу, заснаванага на цікавасці чалавека да таго ці іншага віду гульні, у свабодным характары ўдзелу ў ёй. У гульнявым пакоі прадугледжаны сумесны сямейны ўдзел у розных формах гульнявых зносін. З гэтай мэтай распрацоўваюцца спецыяльныя гульнявыя праграмы: "Калі мы за сталом", "Дзень імяninніка", "Вечары на канапе", "Адпачываем усёй сям'ёй" і г.д. Пры вызначэнні асноўных гульнявых пляцовак улічваюцца галоўныя матывы ўключэння чалавека ў працэс гульні, сярод якіх вылучаюць наступныя: зносіны, рэалізацыя свайго "Я", забаўка, творчасць і інш. Лепшыя гульні і гульнявыя праграмы фармуюць фонд гульнятэкі цэнтра.

Мы пералічылі толькі некаторыя прыкладныя формы, якія могуць функцыянаваць у цэнтры сямейна-бытавой культуры. Варыянтаў арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці можа быць мноства. Нельга прадугледзець усё, што можа нарадзіць ініцыятыва цікавых апантаных ідэяй людзей. Арганізатары цэнтру павінны ўмець стварыць умовы для гэтай ініцыятывы і дапамагчы людзям знайсці формы яе праявы.

**Спіс літаратуры**

1. Садовская, В. С. Лабиринты культуры быта : исследование реальности: монография / В. С. Садовская. – М. : МГУКИ, 2003. – 225 с.